2. Конышева, А. В. Современные методы обучения английскому языку / А. В. Конышева. – Минск : ТетраСистемс, 2003. – 175 с.
3. Кузьминова, М. В. Формирование профессиональной коммуникативной иноязычной компетенции в высшей школе / М. В. Кузьминова // Дискуссия [Электронный ресурс]. – 2015. – № 10(62). – С. 153–160. – Режим доступа: https://cyberleninka.ru/article/n/formirovanie-professionalnoy-kommunikativnoy-inoyazychnoy-kompetentsii-v-vysshey-shkole/viewer. – Дата доступа: 9.09.2021

# ВОБРАЗ ВЯНКА Ў БЕЛАРУСКАЙ ВЯСЕЛЬНАЙ ПАЭЗІІ

*Д. Я. Дрозд (Мінск, Беларусь)*

У беларускім вясельным комплексе прысутнічаюць фальклорныя вобразы, характэрныя для перыяду змянення сацыяльнага статусу маладой пары. У артыкуле разглядаецца вобраз вясельнага вянка маладой. Яго прысутнасць у вясельных тэкстах дае магчымасць прасачыць цыкл змен, якія адбываюцца пры ходзе ініцыяцыі маладых. Паступовая трансфармацыя ад сімвала дашлюбнага жыцця як увасаблення найлепшых якасцей дзяўчыны і да змены галаўнога ўбору, як канчатковага пераходу ў жыццё сямейнае, спрыяла далучэнню да сям'і мужа, дабрабыту, шчасцю новай сям'і.

***Ключавыя словы:*** вянок маладой; заручыны; зборная субота; змена галаўнога ўбору маладой.

У беларускім вясельным фальклоры прысутнічаюць сімвалічныя вобразы, якія займаюць важнае месца ў этапах пераходу маладымі з дашлюбнага стану ў стан сямейнага чалавека. Іх наяўнасць характэрна для найбольш важных перыядаў вясельнай ініцыяцыі, сутнасць якой яны дапамагаюць раскрыць.

Праз увесь вясельны комплекс праходзіць вобраз вянка як атрыбут дзяўчыны, паказчык яе адметнасці і адзнака маладой. Дзявочы вянок сімвалізуе прыгажосць, чысціню дзяўчыны, яе вольнае красаванне ў бацькоўскім доме і ў асяроддзі сяброўак.

*Пазнаеш мяне маладзеньку ў таночку,*
*Да ў руцвяненькім вяночку* [1, с. 36, № 5].

Пярловы вяночак з'яўляецца адной з прыкмет, па якіх хлапец выбірае дзяўчыну:

*Андрэйка, наш брацец,*
*Пойдзеш жаніцца…*
*Выйдзець к табе танок дзевак.*
*Адзін танок у золаце,*
*А другі танок у серабрэ.*
*Ты на золата не ганіся,*
*А на золата не квапся.*
*Твая дзяўчына знакомая*
*На галоўцы пярлоў венчык,*
*На ручаньцы золат персцень!* [1, с. 229, № 504].

На заручынах адбываецца першае сімвалічнае адлучэнне дзяўчыны ад дзявочага гурту. Дзяўчына з сумам чакае хуткае развітанне з бацькоўскім домам:

*Мне ў маткі не жыці,*
*Па саду не хадзіці,*
*Вішань не шчыпаці,*
*Красачак не рваці,*
*Вяночка не віці.*
*Я ж адзін была звіла,*
*Я й той не знасіла.*
*Сястрыцу папрасіла:*
*Сястрыца мая родная,*
*Данасі мой вяночак,*
*Дагуляй мой таночак* [1, с. 41, № 17].

Падчас заручын гучаць песні, якія падкрэсліваюць хуткі пераход дзяўчыны ў новы сацыяльны стан – стан замужняй жанчыны:

*Дзевачкі сядзяць, вяночкі дзяржаць,*
*Мяне не прымаюць.*
*Жаночкі сядзяць, сыночкаў дзяржаць,*
*Мяне падзываюць* [1, с. 113, № 201].

У зборную суботу рыхтавалі вясельны вянок. Звіць яго дзяўчына прасіла сваіх сяброўак:

*Да дзевачкі-сястрыцы,*
*Дам жа я вам дарочак:*
*З цвяткоў звіце вяночак,*
*Убярыце галоўку*
*У чужую старонку* [2, с. 204, № 522].

Прадчуванне змен у жыцці дзяўчыны гучыць у песнях:

*Дзевачкі, падружкі вы мае,*
*Звіце ж вы вяночак для мяне,*
*Бо гэты ж вяночак з руты-цвет,*
*Ён жа мне завяжыць белы свет* [2, с. 209, № 535].

У некаторых творах менавіта хлопец дапамагае сваёй выбранніцы звіць вясельны вянок, хаця да яго гэта рабілі маці, бацька, брат і сястра дзяўчыны.

*Ой, вілі, вілі, да не давілі:*
*Руты мала стала.*
*Калечка ідзець, рутачку нясець*
*Вянок давіваці.*
*Ой, вілі, вілі, да ўжо давілі:*
*Руты досыць стала* [2, с. 224, № 573].

Матыў хуткага адлучэння ад роднай хаты і далучэння да сям'і мужа гучыць у песнях, дзе дзяўчына не згаджаецца кінуць віць вянок, а ісці да маці піва піць, а да бацькі – мёд, а на просьбу суджанага адказвае згодай:

*Пакідай, Дунечка, вянкі віць,*
*Хадзі са мной вады піць.*
*Прашу, Ванечка, вянкі віць,*
*Іду з табой ваду піць* [2, с. 250, № 640].

У адрозненні ад дзявочага, вянчальны вянок вылучае дзяўчыну сярод сяброўак, бо ён з руты, з мяты і з лялеі, і з беленькае паперы, а з чырвонае каліны, і з зялёнае барвіны [2, с. 286, № 725].

Некаторыя песні ўтрымліваюць вобраз вянка «з калючага ельнічку», «з ядленцу». Гэта не толькі адзнака выключнага становішча дзяўчыны, але і знак смутку, жалю, развітання з бацькоўскім домам:

*А дзевачкі, паненачкі вы мае,*
*Сьдзіцеся, збярыцеся да мяне,*
*А савіце мне вяночак, маладзе.*
*Сабе звілі з руты-мяты, з лялеі,*
*А мне звілі з калючага яленцу.*
*Яленец касіць, галоўку кланіць нізенька* [2, с. 255, № 651].

Менавіта вясельны вянок «адлучае» дзяўчыну ад дзявочага асяроддзя і «прылучае» да асяроддзя замужніх жанчын.

*Не радавайся, Галечка,*
*Што гэты вечар вясёлы,*
*Што гэты венчык пярловы.*
*Гэта ж не венчык – адманшчык:*
*Ён жа ад дзевачак адманіць,*
*Ён жа да жаночак прыманіць* [2, с. 293, № 742].

Функцыяй «адлучэння» надзелены і вянок, які прывозіць хлопец:

*Прыехалі сваты-махляры,*
*Прывезлі вяночак з крапівы,*
*Маладая Манечка, дагадайся,*
*За гэты вяночак не хапайся,*
*Бо гэты вяночак зарэнчоны,*
*Ад другой адлучоны* [2, с. 291, № 737].

Некаторыя песні падкрэсліваюць часовы характар адметнасці маладой, яе перавагу над іншымі дзяўчатамі:

*Сягоння нядзелька,*
*Святы дзянёчак,*
*Звілі дзяўчыне*
*З руты вяночак.*
*Сягоння звілі,*

*А заўтра завяне,*
*Як на шлюб стане* [2, с. 299, № 754].

Звіўшы вянок, яго коцяць па стале (водгук салярнага культу), просячы бацькоў дзяўчыны, часцей маці, прыняць яго і ўскласці на галаву дачкі, гэтым самым пацвердзіўшы згоду і благаславіўшы на шлюб. Часта маці ад жалю не можа прыняць вянок:

*Маё дзіцятка, не магу,*
*А ў жыцці ручак не ўздыму,*
*А за слёзкамі не ўбачу,*
*Што цябе, дзіцятка, утрачу* [2, с. 264, № 676].

У некаторых песнях дзяўчына просіць маці развіць вянок, каб яшчэ пабыць дома:

*Развi, мамачка, ён доўгі,*
*Я пагуляю яшчэ трохі.*
*Развi, мамачка, вяночак,*
*Я пагуляю гадочак.*
*А мне вяночка не развiць,*
*Табе, маладой, у мяне не быць* [2, с. 268, № 686].

Увогуле, вясельны вянок – гэта не толькі атрыбут маладой, але своеасаблівая яе характарыстыка. Па ім даецца ацэнка дзяўчыне роднымі маладога, фарміруюцца адносіны да нявесткі і з боку бацькоў хлопца.

Для вянка бралі кветкі, якія лічыліся сімваламі маральнай чысціні і цнатлівасці: рута, мята, шалфей, лілея.

*Пад аконцам садочак*
*Там Марынка хадзіла,*
*Зёлачкі палівала,*
*Цяжанька ўздыхала:*
*Мне вас болей не паліці,*
*З вас вяночак мне не звіці.*
*Звіюць дзевачкі вяночак*
*З рутачкі, з лялеечкі,*
*З галубой папярачкі* [2, с. 217, № 558].

Песні, якія суправаджалі сустрэчу маладой у сям'і мужа, даюць апісанне яе вянка, нібыта ўпрыгожанага яснымі зоркамі, сонечнымі промнямі, залатымі кветкамі:

*Маладзенькі малойчык,*
*Што ў цябе на куце ззяе?*
*Ці не месяц узыйшоў?*
*Дзевачкі, мае сястрыцы,*
*Ды ў мяне на куце ззяе*
*Дзевачка маладая.*
*У яе на галоўцы*

*Кветачка залатая*
*Ды як сонца іграе* [3, с.157, № 529].

Пасля першай шлюбнай ночы, калі здымалі з галавы маладой вянок і павязвалі хустку, намітку ці чапец, гучалі песні, якія падкрэслівалі яе часовае прамежкавае становішча:

*А ў панядзелак рана*
*Сіняе мора грала,*
*Гануська ваду брала,*
*У свій бок паглядала.*
*Не жаласліва мамка,*
*Не шлець гасцей рана.*
*Галоўка не прыбрана.*
*Галоўка як какоўка,*
*Сама, як жыдоўка.*
*Между дзевак не дзеўка,*
*Между жонак не жонка.*
*Святы панядзелак*
*Адлучыў ад дзевак,*
*А святы аўторак*
*Далучыць да жонак* [3, с. 231, № 836].

Падчас завівання маладой гучаць песні, якія перасцерагаюць яе мяняць вянок на чапец.

*Не скідай вянца,*
*Не кладі чапца,*
*Скінь чапец на градзіцы,*
*Бо зробяць маладзіцай* [3, с. 285, № 1059].

Такім чынам, фальклорным вобразам, які на працягу ўсяго вясельнага цыклу суправаджае абрадавыя дзействы, звязаныя са зменай сацыяльнага статусу маладой пары, з'яўляецца вянок дзяўчыны. У заручынных песнях ён выконвае ролю атрыбута дзявочага, дашлюбнага жыцця. Разам з тым, у гэты перыяд узнікае вобраз вянка як сімвала заручанай дзяўчыны, які азначае яе адлучэнне ад дзявочага асяроддзя. У песнях зборнай суботы ўзнікае вобраз вянчальнага вянка, які павінен канчаткова «перавесці» дзяўчыну з дашлюбнага жыцця ў жыццё сямейнае. Пры гэтым дадзены вобраз адлюстроўвае найлепшыя якасці маладой, якія садзейнічаюць яе далучэнню да сям'і мужа, спрыяюць дабрабыту, шчасцю новай сям'і, добрым адносінам у грамадстве. Змена вянка на хустку ці чапец – канчатковае змяненне статусу дзяўчыны, яе прыняцце ў жаночае асяроддзе.

**_Бібліяграфічны спіс_**

1. Вяселле. Песні. – Мінск : Навука. 1980. – Т. 1. – 680 с.
2. Вяселле. Песні. – Мінск : Навука. 1981. – Т. 2. – 831 с.
3. Вяселле. Песні. – Мінск : Навука. 1983. – Т. 6. – 664 с.